лі б выяўлены прыметы, якія больш «моцна» звязаны або аддзелены ад аб'ектаў, што адлюстроўваюцца крайнімі тэрмінамі. Ва ўсякім выпадку адносіны катодных промняў да электрычнага поля, відаць, маглі быць устаноўлены і раней, калі ўлічваць рэальныя ўмовы той пазнавальнай сітуацыі. Уключэнне адзначаных тут акалічнасцей у кантэкст логіка-метадалагічнай рэфлексіі, на наш погляд, магло б садзейнічаць павышэнню эфектыўнасці навуковых даследаванняў.

Усё гэта яшчэ раз пацвярджае, што сілагістычны метад не толькі прыгодны для доказу вядомых ісцін, як аб гэтым часам мяркуюць, але ён актыўна выкарыстоўваецца і ў вывучэнні, даследаванні невядомага, а значыць, у прадуцыраванні новых ведаў. У атрыбутыўным жа варыянце ён, на наш погляд, максімальна прыбліжаны да натуральнай мовы і спосабу разважання.

*Інстытут філасофіі і права АН БССР*


## Резюме

Описывается ранее не отмечаемый в литературе варнант снллогистического метода познания, который назван атрибутивно-снллогистическнм. Обнаружнвается данный метод в результате синтеза предлагаемого подхода к логической классифнкацнн существенных признаков предмета н ранее разработанного нами варнанта полностью квантифицированной силлогистнки. На осиове аналнза конкретных снтуацнй нз нсторнн науки показывается роль этого метода в познанни.

## Summary

A description is given of the variant of the syllogistic method of knowledge named the attributive-syllogistic one which has not been reported earlier in the literature. The given method is a result of synthesis of the suggested approach to logic classification of essential signs of an object and the variant of the completely quantified syllogistics worked out earlier by the author. An analysis of concrete situations in the science history has shown the role of this method in the process of knowledge.


*В. В. БУШЧЫК*

# ЗМЯНЕННЕ ЗМЕСТУ ПРАЦЫ ГАСПАДАРЧЫХ КІРАЎНІКОЎ ВА ЎМОВАХ ПАСКАРЭННЯ САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАГА РАЗВІЦЦЯ КРАІНЫ

У праграмных дакументах партыі, накіраваных на паскарэнне развіцця краіны, ставіцца задача дасягнення не толькі найвышэйшага эканамічнага, але і сацыяльнага эфекту. Што датычыць сферы вытворчасці, то размова ідзе перш за ўсё аб якасных пераўтварэннях у характары, змесце і ўмовах працы. Пры гэтым трэба ўлічваць, што, з аднаго боку, якаснае змяненне змесату працы выступае як сродак паскарэння, а з другога боку, і як вынік на шляху ператварэння працы ў першую жыццёвую патрэбнасць.

Змест працы зменлівы і дынамічны. Нават параўнальна невялікае ўдасканаленне ў арганізацыі працы змяняе яе змест. У перыяд жа паскарэння сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны, калі пастаўлена мэта карэннай рэканструкцыі народнай гаспадаркі, змяненне зместу працы кіруючых гаспадарчых кадраў з'яўляецца вельмі важнай задачай. Ад намаганняў кіраўнікоў у многім залежаць тэмпы навукова-тэхнічнага прагрэсу, сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны. У сувязі з гэтым з'яўляецца актуальным даследаванне працы кіруючых гаспадарчых кадраў ва ўмовах паскарэння з мэтай выяўлення тэндэнцый у развіцці яе зместу.

Вывучэнне працоўнай і прафесіянальнай дзейнасці кіруючых гаспадарчых кадраў метадамі прыкладной сацыялогіі патрабуе разгляду не-

каторых найбольш агульных праблем зместу працы. Большасць вучоных у аснову вызначэння зместу працы кладуць працоўныя функцыі. Разам з тым адзіная і агульнапрызнаная класіфікацыя гэтых функцый яшчэ не распрацавана.

Некаторыя аўтары імкнуцца вылучыць найбольш агульныя, універсальныя функцыі, з дапамогай якіх можна даследаваць змест любога віду працы незалежна ад узроўню развіцця навукова-тэхнічнага прагрэсу, што зніжае магчымасць іх прымянення ў даследаваннях і на практыцы. Акрамя таго, канцэнтрацыя ўвагі толькі на агульных працоўных функцыях значна абядняе ўяўленне аб самім змесце працы, зніжае магчымасць падрабязнага аналізу яго якасных характарыстык.

Сацыялагічнае даследаванне зместу працы пэўных груп работнікаў, на нашу думку, павінна ўлічваць узровень сродкаў і прылад працы, вытворчых і сацыяльна-эканамічных умоў. Адсюль вынікае, што разам з найбольш агульнымі функцыямі працы на пэўных этапах развіцця вытворчасці могуць актуалізавацца асобныя «прыватныя» функцыі, якія патрабуюць больш пільнага і падрабязнага вывучэння. Так, напрыклад, на этапе паскарэння сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны для кіруючых гаспадарчых кадраў асабліва важныя творчая функцыя, адміністрацыйна-арганізатарскія здольнасці, уменне працаваць з людзьмі, прымяняць у рабоце новае, перадавое і інш.

Пры даследаванні функцыянальнай занятасці кіраўнікоў і спецыялістаў на прыкладзе будаўнічых арганізацый Міністэрства будаўніцтва БССР вывучаны затраты рабочага часу на выкананне працоўных функцый дадзенымі работнікамі. У адпаведнасці з задачамі даследавання інжынерна-тэхнічныя работнікі ў выбарачнай сукупнасці былі падзелены на шэсць найбольш характэрных па зместу працы груп. У першую групу ўвайшлі кіраўнікі будаўнічых, мантажных арганізацый (кіраўнікі трэстаў і іх намеснікі, начальнікі будаўнічых, будаўніча-мантажных, мантажных, спецыялізаваных упраўленняў і іх намеснікі, галоўныя інжынеры трэстаў і ўпраўленняў). Другую групу склалі начальнікі аддзелаў будаўнічых трэстаў і ўпраўленняў, трэцюю — інжынеры, занятыя ў кіраўніцкім апараце названых арганізацый. У наступныя групы ўключаны лінейныя інжынерна-тэхнічныя работнікі: старшыя прарабы (начальнікі ўчасткаў); вытворцы работ; майстры вытворчых участкаў.

Такая групоўка інжынерна-тэхнічных работнікаў дазваляе максімальна ўявіць генеральную сукупнасць. Названыя групы работнікаў складаюць 82,5% ад колькасці інжынерна-тэхнічных работнікаў Мінбуда БССР, занятых у будаўнічых, будаўніча-мантажных, мантажных і спецыялізаваных упраўленнях [1].

Для аналізу дзейнасці інжынерна-тэхнічных работнікаў, ацэнкі імі меры творчасці ў працы вылучаны наступныя функцыі: адміністрацыйна-арганізатарская; інжынерна-творчая; выкананне тэхнічнай і дапаможнай работы; вытворчыя пасяджэнні і нарады; выкананне функцый, якія не адпавядаюць пасадзе. Кожны апытаны павінен быў адзначыць, колькі часу ў працэнтных адносінах у сярэднім ён затрачвае на працягу рабочага дня на выкананне дадзеных функцый.

Аналіз ацэнкі рознымі групамі інжынерна-тэхнічных работнікаў выконваемых імі функцый паказвае, што для кіруючых гаспадарчых кадраў адной з вядучых працоўных функцый з'яўляецца адміністрацыйна-арганізатарская. Як відаць з вынікаў апытання, кіраўнікі трэстаў, будаўнічых упраўленняў і іх намеснікі на адміністрацыйна-арганізатарскую работу затрачваюць штодзённа ў сярэднім 44,5% рабочага часу, 33,3 і 30,5% — адпаведна старшыя прарабы і вытворцы работ, 28,4% — майстры, 21,3% — начальнікі аддзелаў.

Вядучая роля адміністрацыйна-арганізатарскай функцыі ў змесце

[1] Разлічана намі па даных формы №8-3 статыстычнай справаздачнасці Міністэрства будаўніцтва БССР за 1984 г.

кіраўнікоў (майстроў, прарабаў, начальнікаў участкаў). Напрыклад, чатыры з кожных пяці апытаных рабочых лічаць, што прастоі ўзнікаюць на аб'ектах у асноўным з-за несвоечасовай і некамплектнай пастаўкі матэрыялаў. Часам брыгады прастойваюць з-за адсутнасці машын і механізмаў. Узнікаюць такія прастоі па віне саміх кіраўнікоў будоўляў. Адсюль і некаторы іх лібералізм да тых, хто спазняецца на работу, да падаўжэння абедзеннага перапынку, заўчаснага пакідання аб'ектаў.

Такім чынам, аналіз статыстычных даных, вынікаў сацыялагічнага даследавання дысцыпліны працы ў будаўнічых арганізацыях рэспублікі паказвае, што яшчэ патрэбна шмат намаганняў для ліквідацыі ўмоў, якія садзейнічаюць парушэнням дысцыпліны, далейшай сістэматызацыі шляхоў і спосабаў найбольш поўнага і прадукцыйнага выкарыстання рабочага часу. Вялікую ролю ў гэтым адыгрываюць кіруючыя гаспадарчыя кадры, таму і ставяцца якасна новыя патрабаванні да ўмення кіраўніка наладжваць і падтрымліваць працоўную і вытворчую дысцыпліну.

У змесце працы кіруючых гаспадарчых кадраў вылучаецца і такая функцыя, як ажыццяўленне кантролю і спагнання. На неабходнасць валодання такой функцыяй начальнікам будаўнічага ўпраўлення ўказалі 38,2% экспертаў, начальнікам аддзела — 25,7, прарабам — 23,9%.

Рэалізацыя дадзенай функцыі ў працы кіраўнікоў неаддзельная ад такой якасці, як патрабавальнасць. Адказваючы на пытанне «Якія якасці, на Ваш погляд, у першую чаргу неабходны кіраўніку працоўнага калектыву?», іменна яе эксперты паставілі на першае месца. Іх вывад пацвердзіўся і вынікамі другога этапу даследавання: 72,7% ад агульнай колькасці рэспандэнтаў таксама назвалі дадзеную якасць галоўнай.

Усё гэта сведчыць аб тым, што навядзенне парадку і арганізаванасці на вытворчасці мае на мэце павышэнне патрабавальнасці да кадраў, узмацненне кантролю і попыту. У дакладзе на чэрвеньскім (1987 г.) Пленуме ЦК КПСС аб задачах партыі па карэннай перабудове кіравання эканомікай М. С. Гарбачоў адзначаў, што барацьба за дысцыпліну і парадак вядзецца вельмі слаба. Гэта выклікае неабходнасць «дзейнічаць яшчэ больш рашуча, умацоўваць паўсюдна дысцыпліну, арганізаванасць, адказнасць і выканаўчасць на ўсіх узроўнях» [5].

Практыка паказвае, што патрабавальнасць у большасці выпадкаў разумеецца кіраўнікамі аднабакова. Аналіз прычын і характару парушэнняў працоўнай і вытворчай дысцыпліны інжынерна-тэхнічнымі работнікамі будаўнічых арганізацый Мінбуда БССР паказаў, што многія парушэнні допушчаны з-за недастатковага вытворчага вопыту, няўмення арганізаваць работу падначаленых, ажыццяўляць кантроль за вытворчасцю работ і да т. п. І тут важна давер'е да здольнасцей і магчымасцей чалавека, аказанне яму канкрэтнай дапамогі, заахвочванне ініцыятывы. Аднак многія вышэйшыя кіраўнікі ідуць толькі па шляху вынясення спагнанняў.

Практыка прымянення мер уздзеяння да ІТР у абследаваных арганізацыях паказвае, што амаль кожны другі з іх атрымаў на працягу года спагнанні за хібы ў рабоце. Больш за ўсё спагнанняў прыпадае на лінейных інжынерна-тэхнічных работнікаў. Так, напрыклад, на майстроў прыходзіцца 35,6% ад колькасці прынятых мер уздзеяння, на прарабаў — 30,6, старшых прарабаў (начальнікаў участкаў) — 16,9%.

Сярод мер уздзеяння, якія прымяняюцца да ІТР, пераважную ўдзельную вагу займаюць дысцыплінарныя: вымовы і строгія вымовы. Паколькі эфектыўнасць іх нізкая, то гэта вядзе да вынясення аднаму работніку пяці-шасці спагнанняў на працягу года. Так, па абследаваных

[5] Материалы Пленума Центрального Комитета КПСС, 25—26 июня 1987 г. М., 1987. С. 19.

арганізацыях атрымалі пяць і больш спагнанняў 19,2% старшых прарабаў (з атрымаўшых спагнанні), 21,6% прарабаў, 15,1% майстроў.

Вялікая ўдзельная вага пакаранняў сведчыць хутчэй аб няўменні кіраўнікоў, якія маюць права выносіць спагнанні ў загадзе, наладжваць дысцыпліну ў калектыве, чым аб актыўнай рабоце па навядзенню парадку на будоўлі. Такі стыль работы кіраўнікоў вымушае і добрых спецыялістаў мяняць месца работы, што яшчэ больш ускладняе становішча. Так, напрыклад, у трэсце № 4 Мінбуда БССР у канцы 80-х гадоў за невялікі адрэзак часу практычна абнавіўся састаў інжынерна-тэхнічных работнікаў апарату трэста і будаўнічых упраўленняў. Некалькі пазней такая ж сітуацыя паўтарылася і ў трэсце № 7. Такое становішча назіраецца і сёння ў радзе будаўнічых упраўленняў.

Закранаючы гэтыя бакі дзейнасці кіраўнікоў, на студзеньскім (1987 г.) Пленуме ЦК КПСС адзначалася, што кадрам яшчэ трэба вучыцца прынцыповасці, патрабавальнасці і ўважлівасці. Акрамя таго, «трэба рашуча пазбавіцца ад такіх, з дазволу сказаць, метадаў, як разнос, разгон, накачка» [6].

Ва ўмовах паскарэння сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны вялікая ўвага надаецца развіццю творчасці ўсіх працоўных. Актуалізацыя творчай функцыі ў змесце працы інжынерна-тэхнічных работнікаў выклікана неабходнасцю выпраўлення памылак мінулага. На чэрвеньскім (1986 г.) Пленуме ЦК КПСС адзначалася, што ў 70—80-я гады «была падарвана прэстыжнасць інжынернай творчасці, страчаны сусветна вядомыя айчынныя школы распрацоўшчыкаў тэхнікі. Склалася трывалая філасофія перайманне і пасрэднасці. У выніку частка прадукцыі не адпавядае сучаснаму ўзроўню навукі і тэхнікі» [7].

Аналіз ацэнкі рознымі групамі інжынерна-тэхнічных работнікаў выконваемых імі функцый паказвае, што на ўласна інжынерна-творчую работу яны затрачваюць адносна мала рабочага часу. Так, напрыклад, кіраўнікі трэстаў, будаўнічых упраўленняў і іх намеснікі на выкананне дадзенай функцыі затрачваюць штодзённа ў сярэднім 9,8% ад агульнага аб'ёму рабочага часу, начальнікі аддзелаў — 16,5%. Мала адрозніваюцца затраты рабочага часу на выкананне інжынерна-творчай функцыі лінейнымі інжынерна-тэхнічнымі работнікамі. Старшыя прарабы (начальнікі ўчасткаў) на гэту работу затрачваюць у сярэднім 14,6% рабочага часу, вытворцы работ — 13,8, майстры — 14,5%.

Аб слабай насычанасці творчымі элементамі зместу працы ІТР сведчыць і той факт, што ў абследаваных будаўнічых арганізацыях Мінбуда БССР за 1985 г. унеслі рацыяналізатарскія прапановы толькі 14,4% работнікаў, якія займаюць пасады інжынераў, 14,2% начальнікаў аддзелаў, 15,7% майстроў, 26,8% першых кіраўнікоў будаўнічага ўпраўлення. Больш актыўную рацыяналізатарскую работу вялі старшыя прарабы і прарабы. Сярод іх мелі рацыяналізатарскія прапановы адпаведна 51,9 і 36,1% работнікаў.

У той жа час кіруючыя гаспадарчыя кадры будаўнічых арганізацый у два разы больш затрачваюць рабочага часу на тэхнічную і дапаможную работу ў параўнанні з інжынерна-творчай. На выкананне функцый, якія не адпавядаюць пасадзе, вытворцы работ затрачваюць 16% рабочага часу, майстры — 15,1, старшыя прарабы (начальнікі ўчасткаў) — 12,3, кіраўнікі трэстаў, будаўнічых упраўленняў і іх намеснікі — 10,1%. Многа рабочага часу затрачваецца непрадукцыйна на пасяджэнні і нарады. Усё гэта сведчыць аб нерацыянальным выдаткаванні працы кіраўнікоў і спецыялістаў на будоўлі.

Гэты вывад пацвярджаюць і самі работнікі будаўнічых арганізацый. Паводле іх сведчання, у апошнія гады будоўлі пачалі абрастаць дзела-

[6] Материалы Пленума Центрального Комитета КПСС. 27—28 января 1987 г. С. 49.
[7] Материалы Пленума Центрального Комитета КПСС. 16 июня 1986 г. М., 1986. С. 16—17.

вымі паперамі. Сярод іх шматлікія акты, розныя формы пааперацыйнага кантролю, сеткавыя графікі, дыяграмы. За змену майстар ці прараб запаўняе дзесяткі граф у розных журналах кантролю вытворчасці работ [8]. У выніку інжынерна-тэхнічным работнікам прыходзіцца многа працаваць звыш нарматыўна ўстаноўленай працягласці рабочага дня. Як відаць з вынікаў апытання, лінейныя ІТР (майстры, прарабы, старшыя прарабы) працягваюць свой рабочы дзень на адну-паўтары гадзіны, кіраўнікі трэстаў, будаўнічых упраўленняў і іх намеснікі вымушаны працаваць дадаткова звыш дзвюх гадзін штодзённа.

Такім чынам, упарадкаванне і дакладнае выкананне функцыянальных абавязкаў дазволіць вызваліць ІТР, асабліва лінейных, ад многіх даручэнняў, якія не прадугледжаны службовымі абавязкамі, вялікага аб'ёму тэхнічнай і дапаможнай работы. Усё гэта павінна станоўча ўплываць на далейшае павышэнне эфектыўнасці інжынерна-кіраўніцкай працы, павелічэнне магчымасцей для творчай работы.

Ва ўмовах паскарэння сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на аснове навукова-тэхнічнага прагрэсу разам з творчай актуалізуецца і такая функцыя, як укараненне ў вытворчасць новай тэхнікі, абсталявання, перадавой тэхналогіі, прагрэсіўных форм арганізацыі працы. Адной з вядучых дадзеная функцыя ў працы кіраўнікоў становіцца таму, што асноўнай мэтай і вынікам дзейнасці прадпрыемства на сучасным этапе развіцця эканомікі з'яўляецца выпуск прадукцыі вышэйшай якасці, канкурэнтаздольнай на сусветным рынку.

Гэта функцыя ў працы кіраўніка важная і таму, што ў новых умовах гаспадарання на аснове гаспадарчага разліку, самаакупнасці і самафінансавання выпуск эфектыўнай і высакаякаснай прадукцыі з'яўляецца важным шляхам нарошчвання прыбытку (даходу) прадпрыемства і самафінансавання яго вытворчага і сацыяльнага развіцця. Недаацэнка гэтай функцыі ў працы кіраўніка вядзе да страт у даходзе калектыву і ў канчатковым выніку да страт у заработнай плаце і іншых сацыяльных даброта́х.

Важнай вытворчай функцыяй у змесце працы кіруючых гаспадарчых кадраў ва ўмовах перабудовы народнай гаспадаркі з'яўляецца ўменне згуртоўваць і накіроўваць калектыў на выкананне вытворчых планаў. Неабходнасць валодання такой функцыяй начальнікам будаўнічага ўпраўлення адзначылі 33,1% экспертаў, начальнікам аддзелаў — 31,1, прарабам — 23,1%.

Кіраўнікам будаўнічай вытворчасці, асабліва лінейным, часта прыходзіцца вырашаць задачы, звязаныя з фарміраваннем псіхалагічнага клімату ў калектыве, паляпшэннем умоў працы і быту, арганізацыяй сацыялістычнага спаборніцтва і г. д., падпарадкоўваючы іх вырашэнне праблемам павышэння эфектыўнасці вытворчасці. У сувязі з гэтым кіраўнік павінен валодаць не толькі прафесіянальнымі ведамі і вопытам, але формамі і метадамі партыйна-палітычнай работы.

Выклікана такое становішча яшчэ і тым, што ў будаўнічых арганізацыях створаны і функцыяніруюць розныя грамадскія фарміраванні, такія, як грамадскія аддзелы кадраў, саветы прафілактыкі, майстроў, настаўнікаў, брыгадзіраў і інш. Аднак, як паказвае практыка, іх работа часта носіць фармальны характар. Умелая работа кіраўніка з актывам значна павысіць эфектыўнасць усёй дзейнасці дадзеных грамадскіх фарміраванняў, што дазволіць яму паспяхова ажыццяўляць функцыю па згуртаванню і мабілізацыі калектыву на выкананне вытворчых планаў.

Выпрацоўка і прыняцце рашэнняў з'яўляюцца традыцыйнай працоўнай функцыяй у змесце працы кіруючых гаспадарчых кадраў. У мінулым было дапушчана нямала памылак у яе ажыццяўленні. У матэрыялах студзеньскага (1987 г.) Пленума ЦК КПСС адзначалася, што на

[8] Советская Белоруссия. 1986. 6 чэрв.

рубяжы 70—80-х гадоў былі допушчаны парушэнні калегіяльнасці ў рабоце, пераважаў тэхнакратычны, «адміністрацыйна-націскны» стыль работы[9]. Многія рашэнні прымаліся кіраўнікамі толькі пасля доўгіх узгадненняў і абмеркаванняў з вышэйшымі органамі. У многіх выпадках пры прыняцці рашэнняў не ўлічвалася думка працоўных калектываў.

Аналіз вынікаў апытання рабочых будаўнічых арганізацый БССР паказаў, што нават па такіх важных для працоўнага калектыву пытаннях, як заахвочванне перадавікоў вытворчасці і пакаранне парушальнікаў працоўнай і вытворчай дысцыпліны, часам прымаліся аднаасобныя рашэнні. Так, напрыклад, толькі 41,3% рабочых указалі, што з імі раяцца кіраўнікі пры заахвочванні перадавікоў і 40,5% — пры пакаранні парушальнікаў. Астатнія рэспандэнты далі адмоўныя адказы.

Дэмакратыя, публічнасць, новыя ўмовы гаспадарання ствараюць рэальныя перадумовы для выпрацоўкі і прыняцця рашэнняў з удзелам усіх работнікаў прадпрыемстваў і арганізацый. Права працоўных на ўдзел у абмеркаванні і прыняцці рашэнняў непасрэдна на сходзе ці праз саветы працоўных калектываў замацавана ў Законе СССР аб дзяржаўным прадпрыемстве (аб'яднанні).

Такім чынам, сацыялагічнае даследаванне паказвае, што ў сучасных умовах гаспадарання якасна змяняецца змест працы кіруючых гаспадарчых кадраў. З выкарыстаннем функцыянальнага падыходу выяўлены працоўныя функцыі, якія сёння вылучаюцца на першае месца ў змесце працы кіраўніка. Сярод іх названы такія, як творчая, наладжванне працоўнай і вытворчай дысцыпліны, ажыццяўленне кантролю і спагнання, згуртаванне калектыву і накіраванне на выкананне планаў, выпрацоўка і прыняцце рашэнняў, уменне працаваць з людзьмі.

Даследаванне выявіла непадрыхтаванасць часткі кіраўнікоў да ажыццяўлення якасна новых працоўных функцый ва ўмовах перабудовы. Гэта з'яўляецца вынікам памылак, якія дапускаліся ў кадравай палітыцы ў мінулым, адставання вышэйшай школы ад патрэбнасцей сучаснай вытворчасці, недасканаласці работы з кадрамі на самой вытворчасці.

Ва ўмовах паскарэння сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны вырашэнне адзначаных праблем можа ісці шляхам карэннага паляпшэння ўмоў і арганізацыі працы ІТР, упарадкавання іх функцыянальных абавязкаў, вызвалення ад вялікага аб'ёму тэхнічнай і дапаможнай работы. Другім важным напрамкам павышэння эфектыўнасці працы кіруючых гаспадарчых кадраў з'яўляецца якасна новы ўзровень падрыхтоўкі ІТР да кіруючай работы як у ВНУ, так і непасрэдна на вытворчасці.

*Інстытут філасофіі і права АН БССР*

## Резюме

На материалах конкретного социологического исследования проанализировано изменение содержания труда руководящих хозяйственных кадров строительных организаций БССР в условиях ускорения социально-экономического развития страны.

## Summary

The results of a concrete sociological research study have been analysed to show a change in the content of labour of the leading economic personnel of building organizations in the Byelorussian SSR under the conditions of speeding-up of social-economic development of the country.

[9] Материалы Пленума Центрального Комитета КПСС. 27—28 января 1987 г. С. 13, 43.